View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



# ЛІРЫКА АЛЕСЯ ПІСЬМЯНКОВА: ЭВАЛЮЦЫЯ МАСТАЦКАГА МЫСЛЕННЯ

Н.В. Заяц
БДПУ (Мінск)

Творчы набытак А. Пісьмянкова ў параўнанні з равеснікамі-калегамі па літаратурным цэху невялікі. “Пісаў ён мала, але грунтоўна. Быццам адразу збіраў выбранае” [2, с. 3]. Відаць, таму і няма ў яго выпадковых, “прахадных” вершаў, з самага пачатку яго тэксты вызначаліся шчырымі, непасрэднымі інтанацыямі, маляўнічымі вобразамі, “тэхнічнай” дасканаласцю і вытанчанасцю. Творы лірычных зборнікаў “Белы камень” (1983), “Чытаю зоры” (1988), “Планіда” (1994), “Вершы” (1997) адпавядаюць высокаму мастацка-эстэтычнаму ўзроўню. Найбольш яркія вершы ўвайшлі ў выбранае – зборнік прысвечаных малой радзіме твораў “Журавель над студняй” (1998) і том “Я не памру, пакуль люблю” (2000), падрыхтаваны ў серыі “Беларуская паэзія XX стагоддзя”. Дзякуючы старанням сябра і калегі В. Шніпа, выйшла пасмяротная кніга А. Пісьмянкова “Думаць вершы…” (2005), якую склалі лірычныя творы, эсэ, успаміны, а таксама згадкі пра самога паэта.

З самага пачатку ў мастацка-вобразным свеце пісьмянкоўскай лірыкі галоўнае месца займае рака Бесядзь і яе наваколле. На працягу ўсяго паэтычнага шляху аўтар будзе *“чытаць тапаніміку”* родных мясцін, адкрываць іх наноў. Пры відавочнай “закаханасці” ў малую радзіму паэт выказвае свае пачуцці стрымана, і гэта ўспрымаецца як сведчанне іх сапраўднасці. У яго вершы за знешняй строгасцю радка і нешматслоўнасцю хаваюцца ўзвышаная ўсхваляванасць, унутраная экспрэсія. Творы вызначаюцца адметнай песеннай, рытміка-інтанацыйнай арганізацыяй, моўнай мелодыкай: *“Ты адбі мне тэлеграму, / Што і ў нашай старане / Ў ціхай вёсцы Белы Камень / Выпаў белы-белы снег. / Вёсак многа. Ёсць другія. / Ў вёсках нашы карані. / У мяне не настальгія – / Проста сум па чысціні”* [4, с. 9] (“Ты адбі мне тэлеграму…”).

*“Любоў вялікая”* да Радзімы ў А. Пісьмянкова неадлучная ад любові да знаёмых з дзяцінства мясцін, да блізкіх, дарагіх людзей – землякоў, родных і ў першую чаргу да маці. Вобраз маці прысутнічае і ў ранняй лірыцы паэта, але ключавым, канцэптуальна значным ён становіцца ў творах апошніх гадоў: “*Малюю – / Мілую / Радзіму малую: / Загутую рэчку, / Лясное мястэчка. / Малюю старанна / Сярэбраны ранак, / Сасоннік, алешнік, / Рабіну, канешне ж, / З адвечнай самотай / На сінім сумёце. / Вось дом / Пад бярозай, / Вось дым / На марозе, / Вось след / Каля брамы: / МАМА…”* [3, с. 6] (“Бялынкавічы”). Пасля смерці самага блізкага чалавека паэтам авалодваюць горыч і смутак – асірацелы лірычны герой многіх вершаў не мае душэўнага апірышча, востра адчувае ўласную адзіноту (“Папрок”, “Прыязджай”, “Ноч, поўня”, “Дом і дым”).

У лірыцы атрымлівае ўвасабленне і развіццё матыў вяртання на радзіму і ў сувязі з ім – матыў душэўнай раздвоенасці. У горадзе з адмежаванасцю, замкнёнасцю яго насельнікаў аўтар, як і іншыя пісьменнікі сялянскага паходжання, са шкадаваннем згадвае вясковую даверлівасць, адкрытасць і шчырасць (“Да вытокаў”, “Успамін пра давер”, “Продкі”, “Санны след”, “Зноў пра санны след”). Лірычны герой адчувае няпэўнасць свайго становішча: “*Я не той, не свой, вясковы / І зусім не гарадскі”* [4, с. 21]. Пачуццё душэўнай неўладкаванасці яшчэ больш узмацняецца ад усведамлення таго, што ад’езд з вёскі можа абярнуцца стратай генетычнай сувязі паміж продкамі і наступнымі пакаленнямі (“*Страшна, што сын-гараджанін / Босы баіцца ступіць на траву”* [4, с. 31]).

Нягледзячы на іншае месца жыхарства, духоўная прывязанасць да малой радзімы для паэта выступае своеасаблівым абярэгам ад турбот і непрыемнасцяў, крыніцай энергії – жыццёвай і творчай. Упэўненасць А. Пісьмянкова ў тым, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

менавіта родным мясцінам ён абавязаны літаратурнымі здольнасцямі, абумоўліваюць актуалізацыю вобраза малой радзімы і ў вершах на тэму мастака і мастацтва (“Я прыеду, я вярнуся…”, “Замест аўтабіяграфіі”, “Калядныя строфы”).

Па назіранні крытыка А. Марціновіча, “А. Пісьмянкоў – адзін з нямногіх, хто з першых жа сваіх творчых крокаў <…> адразу намацаў тую сцяжыну, што вядзе ў мінуўшчыну роднага краю, кранаецца самых вытокаў, а ўжо з гэтых агледзін даўніны паспяхова перайшоў і да больш глыбокага асэнсавання паняцця Радзімы, Бацькаўшчыны, Беларусі” [1, с. 183]. Паэт стварае галерэю вобразаў гістарычных асоб, прычым яго цікавяць не толькі знакамітыя персанажы (“Дума Вітаўта”, “Насовіч, 1870”, “Кастусь і Марыся”), але і простыя, звычайныя людзі (“Балада роду”, “Званар”). У такіх творах мастацкая дэталь выступае імпульсам для развіцця паэтычнай думкі, будзіць уяўленне. Так, у вобліку летапісца аўтар вылучае ягоныя вочы, у якіх увабраны *“боль стагоддзяў”* (“Вочы летапісца”); за скупым, лапідарным запісам у летапісе *“мужествовав крепко”* яму бачыцца бясстрашны воін у крывавай бataліі (“Якаў Палачанін”). Мастацкая рэканструкцыя характару беларуса, які жыў шмат стагоддзяў таму, у лірыцы А. Пісьмянкова мае сваю спецыфіку. Аўтар нібы ўступае ў завочную палеміку з літаратурнымі папярэднікамі, прадстаўнікамі рэалістычнага кірунку, не прымаючы растыражаваны вобраз прыгнечанага, забітага мужыка-беларуса. А. Пісьмянкову, відавочна, больш блізкі рамантычны, караткевічаўскі погляд на нацыянальны характар: у яго беларус – велічная, высакародная, гераічная, бясстрашная, адукаваная, вартая павагі і захаплення асоба. Падобная рэпрэзентацыя не супярэчыць гістарычнай праўдзе, садзейнічае абуджэнню нацыянальнага гонару, а таму не можа не імпанаваць.

Калі падзеі і асобы далёкага мінулага паўстаюць у ідэальным асвятленні, то перыпетыі XX стагоддзя ўзнаўляюцца ў драматычным аспекце. А. Пісьмянкоў шукае прычыны сучаснай бездухоўнасці і знаходзіць іх у руйнаванні храмаў (“Царква”), у апантанасці і бяздумнасці служак камуністычнага рэжыму (“Камісар”). У ліку “гістарычных” вылучаецца верш “Мае рэліквіі”: *“Не багата па ліку / Ад продкаў рэліквій: / Сявенька для жыта, / Меч старажытны. / Шолам з Нямігі, / Скарынава кніга. / Ад каня Кастусёва / На [illegible]часце падкова”* [4, с. 59]. Абвяшчаючы такім чынам уласныя каштоўнасныя прыярытэты, паэт выяўляе сваю грамадзянскую пазіцыю. Варта адзначыць, што ў творчасці А. Пісьмянкова грамадзянская лірыка ў чыстым выглядзе, калі пад ёю разумець вершы, у якіх адкрыта абвяшчаюцца адносіны аўтара да сацыяльнага жыцця, не прадстаўлена. Яго мастацкія тэксты пазбаўлены прамой ацэначнасці, трыбуннасці, эмацыйнага напалу, характэрных для гэтай жанравай формы. Для лірыка А. Пісьмянкова складаны сацыяльны свет не з’яўляецца аб’ектам паэтызацыі. Створаная аўтарам мастацкая рэальнасць падкрэслена суб’ектыўная, заснаваная на самасузіранні, але яна далёкая ад таго, каб лічыцца ідэальнай і простай. З самага пачатку лірычнага героя суправаджаюць трывога, сум, адчуванне адзіноты, якія ўзнікаюць нават у “пазітыўных” юнацкіх вершах. Магчыма, гэты стан – адплата лёсу за падараваны талент: *“Ад неба блізкі ці далёкі, / Хоць у царкве, хоць на піру – / Паэт заўсёды адзінокі, / Я гаварыў і гавару. / І дакараць яго не трэба – / Яго і так туга шкрабе: / Ён гаманіў нядаўна з небам, / А зараз слухае цябе”* [4, с. 147] (“Ад неба блізкі ці далёкі…”). Матыў адзіноты атрымлівае развіццё ў многіх лірычных творах гэтага аўтара (“На самым дне маёй самоты...”, “Туга”, “Жаданне” і інш.).

Арганічнай для творчага тэмпераменту А. Пісьмянкова з’яўляецца праца ў жанры інтымнай лірыкі – тэма кахання пастаянна знаходзіцца ў полі яго ўвагі. Аднак лірычны герой твораў гэтай праблемна-тэматычнай групы рэдка калі выступае ўзнёслым і бесклапотным, як, напрыклад, у вершах 1981 года “Жытла ў нас не

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

было…”, “Я veni, vidi, vici…” Найчасцей ён задуменны, засмучаны – нават назвы твораў указваюць на іх агульны настрой: “Я прачытаў твае сляды…”, “...А думкі роем...”, “Развітанне”, “Ты ўсміхаешся горка…”, інш. Пачуццё кахання ў А. Пісьмянкова мала ў чым падобнае на шчасце, часцей за ўсё гэта боль і пакута ў рознай ступені праяўлення. Не закранаючы пытання аўтабіяграфічнай асновы твораў, трэба падкрэсліць іх эмацыйную дакладнасць, настраёвую адпаведнасць жанравым параметрам інтымнай лірыкі, лепшыя ўзоры якой ніколі не ствараліся ў мажорных інтанацыях. Элегічнасць, мінорнасць вершаў А. Пісьмянкова на тэму кахання пераконвае ў непадробнасці высокага пачуцця, дакладна ўзнавіць якое ў слове – адзнака сапраўднага таленту.

Творчасць А. Пісьмянкова адметная сваёй роздумнасцю, філасафізмам, што праяўляецца ў вершах рознай праблематыкі (пейзажныя апісанні, творы на тэму кахання, мастака і мастацтва). Асаблівасцю ўласна філасофскай лірыкі гэтага аўтара з’ўяляецца пашырэнне ў ёй фаталістычных матываў. Яны ўзніклі яшчэ ў ранніх творах (“З народнага”), але выразна загучалі ў вершах пасталелага паэта, пачынаючы са зборніка “Планіда”. А. Пісьмянкоў быў упэўнены ў тым, што *“вершы могуць здарацца”* [4, с. 243], але нібы насуперак у многіх творах гаварыў пра сваю хуткую смерць. “Небяспечныя” выказванні прарываліся нават у “нейтральныя” тэксты. Так, у пейзажнай, інтымнай лірыцы паўстаюць вобразы *недапісанага партрэта*, *незавершанага сказа*, узнікае матыў незавершанасці пачатага. Паэт неаднаразова і настойліва рабіў дзёрзкі выклік лёсу, спрабаваў прыўзняць заслону з патаемнага, зазірнуць у небыццё, нібы практыкаваўся ў напісанні эпітафій самому сабе. Верш “Пра вечнае” – яскравы ўзор такой практыкі: *“Кажуць, быў я аблашчаны доляй, / Хоць мой дом не мінала бяда: / Я па мёртвых паплакаў даволі, / А жывых яшчэ болей шкада. / Бо мы ўсе на зямлі гэтай госці, / Не забавімся мы на зямлі, / І калі я пакрыўдзіў кагосьці, / То і мне гэта рана баліць. / Нам усім не хапае спагады, / І любові жывым не стае… / Нам адпушчана так небагата, / Што й грахі не замоліш свае”* [3, с. 28]. Як уяўляецца, гэты твор разам са шматлікімі іншымі падобнай праблемна-тэматычнай скіраванасці стаў развітаннем паэта са светам жывых, вербалізаваным прадчуваннем свайго зыходу, якое неўзабаве спраўдзілася.

Сёння мастацкая спадчына А. Пісьмянкова годна прадстаўляе нацыянальную паэзію канца ХХ стагоддзя. Гэты аўтар прыйшоў у літаратуру ўжо сфарміраваным мастаком: заяўленыя ў першых зборніках тэмы (малой радзімы, гістарычная, кахання, паэта і паэзіі) і матывы (вяртання, аддзіноты, душэўнай раздвоенасці, фатальнай непазбежнасці) паспяхова даследаваліся ў наступных кнігах, паглыбляліся, набывалі ідэйна-сэнсавую аб’ёмнасць. Аднак ранні зыход паэта не дазволіў напоўніцу раскрыцца яго багатаму творчаму патэнцыялу. Недасказ, раптоўны, нечаканы перапынак у літаратурным маўленні, – адзін з любімых паэтычных прыёмаў А. Пісьмянкова – атрымаў драматычную рэалізацыю ў яго ўласным лёсе.

Літаратура

1. Марціновіч, А. Белы бусел над Бесяддзю / А. Марціновіч // Полымя. – 2004. – № 10. – С. 180–190.
2. Марціновіч, А. Праз уласнае сэрца: тэма Радзімы ў творчасці Алеся Пісьмянкова / А. Марціновіч // Роднае слова. – 2005. – № 2. – С. 3–5.
3. Пісьмянкоў, А. Думаць вершы... : вершы, эсэ, успаміны / А. Пісьмянкоў. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 214 с.
4. Пісьмянкоў, А. Я не памру, пакуль люблю : выбранае / А. Пісьмянкоў. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 319 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ